1. **“Паляцеў галуб”** — запісана ад жыхаркі Скірмантава Марыі Пісарэвіч.

Паляцеў галуб у поле жывіцца. Паехаў Ясюк з  дому — жаніцца.

Прыляцеў галуб нажывіўшыся. Прыехаў Ясюк ажаніўшыся.

Стрэла матачка паўдарожанькі сваяго сынка салодкім вінцом.

Сваяго сынка ды салодкім вінцом, а нявестачку ды з атрутачкай.

Сын віна не піў — пад каня выліў, а атрутачку папалам выпіў.

А як выпілі — пахіліліся, сваёй матачцы пакланіліся.

“Не сумела, маць, ты нас сустракаць, а сумей жа, маць, ты нас пахаваць”.

Пахавала сына перад цэркаўкай, а нявестачку па-за цэркаўкай.

На сынку вырас зялёны дубок, на нявестачцы – бела бяроза.

Вось раслі, раслі —  пахіліліся, цераз цэркаўку сашчапіліся.

А галлё з галлём пасплятался, лісце з лісцямі пазліпалася.

А ўсе людзі дзіваваліся, што й на тым свеце улюбляліся.

2. **“Ой, у лесе, лесе ды мядзведзь рыкае”** — запісана ад жыхароў в.Путчына і в. Татаршчына.

Ой, у лесе ды мядзведзь рыкае. Будзе табе, дзеванька, да свякроў ліхая.

Дай няхай рыкае, дай няхай гукае. Да няхай ліхая, я сама такая. (2 разы)

Будзе гаварыці — буду наравіці, а будзе крычаці – я буду маўчаці. (2разы)

Я таму мядзведзю саладзень падкіну, а сваю свякроўку у пярыну кіну (2р)

Смакчы, мой мядзведзю, хоць размарыся! Спі, мая свякроўка, да хоць не прачніся!

**3. “Дробна-драбніца”**

Дробна-драбніца, дробна-драбніца
Дробны дождж ідзе
Ой, сабралася бедна галота
Мёд, гарэлку пье
Ой, сабралася бедна галота
Мёд, гарэлку пье

Выпьем гарэлку яшчэ наліўку
Будзем піць віно,
А хто з нас братцы будзе смяяцца
Будзем біць таго

Пройгрыш

Ой, прыйшоў дзядзька багаты
Насміхаецца,
Ой, за што, за што бедна галота напівацца
Ой, за што, за што бедна галота напівацца

Ой, ты не смейся дзядзька багаты
Ты не смейся з нас
Ой, возьмі дзядзька чарку гарэлкі
Выпі ты за нас

Пройгрыш

Рад бы я выпіць, рад бы я сесці
Рад бы закусіць
Сто рублёў маю, сто рублёў маю
Нейдзе размяніць
Сто рублёў маю, сто рублёў маю
Нейдзе размяніць

У цябе соткі, а ў нас драбніца
Ты не смейся з нас
Ідзі ты к чорту дзядзька багаты
К чорту ідзі ад нас
Ідзі ты к чорту дзядзька багаты
К чорту ідзі ад нас

Адзін за рукі, другі за ногі
Трэці ў карак бье
А не ідзі, не ідзі дзядзька багаты
Дзе галота пье

Пройгрыш 2 разы

Дробна-дробна, драбніца-драбніца
Дробны дождж ідзе
Ой, сабралася бедна галота
Мёд, гарэлку пье

4. **“Калода”**

Каціласся, каціласся калода з печы,
Ударыла,ударыла мілому ў плечы.
Няхай мілы знае, знае і кахае,
Няхай мяне позна ды не чакае.

Пройгрыш

Адзін маргае Ніне, а другі Марыне
Разбівае сэрца напалавіну.
Прыйдзецца, міленькі, у цябе спытаці,
Як ты хочаш Зосю замуж узяці.

Пройгрыш

У садочку Ніна, а ў бары Марына
Хачу расказаць я, што за прычына.
Прыйдзецца дзяўчаты, усё вам расказаці.
Хіба мне, як птушцы, трэба лятаці.

Пройгрыш

Каб ты на вячоркі да нас не прыходзіў
І нас маладзенькіх болей не зводзіў.
Каб ты на дарозе ды спатыкаўся,
Як калода ў печы ды абкураўся.

Пройгрыш

Каціласся, каціласся калода з печы
Ударыла, ударыла мілому ў плечы.
Няхай мілы знае, знае і кахае,
Няхай мяне позна ды не чакае.

**5. “Чарачка-мерачка”**

Ой, чарачка-мерачка ох, медавая!
З кім я цябе піць буду маладая?
З кім я цябе піць буду маладая?

Ой, буду я піць цябе
Ох, смуткаваці
Ды адна без любага начаваці
Ды адна без любага начаваці

Ой, скажы мне чарачка
Ох, без абману
Калі цябе з міленькім піці стану?
Калі цябе з міленькім піці стану?

Ой, не буду піць цябе
Ох, медавая!
Лепш пайду з другім гуляць, маладая
Лепш пайду з другім гуляць, маладая.

**6. Жартоўная “Пра курачку”**.

Была ў мяне курачка-нясушка, а я яе прадала.
А за тыя грошы музыкі харошы наняла, наняла.
Ой, музыкі харошы, вы гуляйце да ночы каваля, эх, каваля!
(прыпеў пасля кожнага радка)

Была ў мяне качачка-нясушка, ды я яе прадала.
Было ў мяне адно парасятка, ды я яго прадала.
Была ў мяне легкава машына, ды я яе прадала.
Быў у мяне ды чалавек добры, а я яго прадала.